ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ЧАЦВЕР 13 ЧЭРВЕНЯ

17—18 (1681—1682)

ЧЫРВОНЫ РАДОК

*Нарэшце ў Белдзяржуніверсітэце створаны Савет па міжнароднаму супрацоўніцтву. Можна спадзявацца, што не стане ён абмяжоўвацца папернай распрацоўкай рэкамендацый, і ў хуткім часе выкладчыкі і студэнты атрымаюць рэальную магчымасць супрацоўнічаць з ВНУ і навуковымі ўстановамі замежных краін.*

* * *

*Дзесяці нарвежскім выпускнікам уручаны дыпломы аб заканчэнні Беларускай вышэйшай народнай школы — Міжнароднага экалагічнага і культурнага Цэнтра — і дыпломы аб заканчэнні інтэнсіўнага курса рускай мовы, дзе навучэнцы паказалі добрыя веды. Беларускія выпускнікі атрымаюць дыпломы пасля вучэбна-вытворчай практыкі ў Нарвегіі і субяседвання.*

* * *

*З наступнага навучальнага года значна паменшыцца колькасць замежных слухачоў на падрыхтоўчым факультэце БДУ. З гэтай нагоды скасавана рашэнне аб конкурсе на замяшчэнне пасад выкладчыкаў на падфаку для замежнікаў, бо на факультэце чакаецца скарачэнне выкладчыцкага саставу.*

* * *

*Мала хто са студэнтаў ведае пра існаванне вучэбнага плана па праграме «Ахова працы ў студэнцкіх атрадах». Згодна з гэтым планам, ні адзін студатрад не застанецца па-за ўвагай. У трэцім працоўным семестры студэнтаў чакае 240 гадзін заняткаў і экзамен па тэхніцы бяспекі.*

## Усёй групай у ТБМ!

У апошні час шмат людзей прыходзіць да разумення неабходнасці адраджэння роднай мовы. Нядаўна яшчэ аднай суполкай сяброў беларускай мовы стала больш. На філфаку падрыхтоўчага аддзялення БДУ створана таварыства беларускай мовы. Абраны старшыня, намеснік, сакратар. Варта дадаць, што ў Таварыства ўвайшлі ўсе слухачы беларускага аддзялення — будучыя выкладчыкі беларускай мовы і літаратуры.

А. СТРЭЛЬНІКАЎ.

ЗАПРАШЭННЕ

## ДА РАЗМОВЫ НА РОДНАЙ МОВЕ

ДЫСКУСІЙНЫ клуб камуністаў БДУ на сваім нядаўнім пасяджэнні закрануў праблему, якая ўжо даўно хвалюе студэнтаў і выкладчыкаў, камуністаў і нефармалаў, людзей іншых партый,— праблему адраджэння нацыянальнай культуры.

Прысутныя падтрымалі думку аб стварэнні менавіта нацыянальнага універсітэта, неабходнасці ажыццяўлення асветніцкай дзейнасці: стварэнні этнаграфічнага музея, лектарскіх груп па пытаннях гісторыі, нацыянальных традыцый. А першую ў наступным навучальным годзе лекцыю на ўсіх факультэтах вырашылі правесці на беларускай мове.

— Падтрымалі і нашу прапанову, — гаворыць Людміла Міхайлаўна ХУХЛЫНДЗІНА, намеснік сакратара парткома універсітэта,— аб адкрыцці курсаў беларускай мовы. Ужо ёсць дагаворанасць з філфакам. Плануецца стварыць дзве групы: для пачынаючых вывучаць беларускую мову і для тых, хто мае жаданне паглыбіць свае веды. Навучанне бясплатнае. Курсы пачнуць працаваць з першага верасня, дарэчы, на грамадскіх пачатках, за кошт сродкаў парткамітэта.




## НЕ СПАЦЬ!..

Добрай раніцы, студэнт! Ці добра ты спаў на лекцыях? Прачніся нарэшце — у свеце лета, ва універсітэце сесія.

ЯК ПРАЕХАЦЬ?

## Праз Слуцак — у Феадосію

Не здзіўляйцеся — у кожнага свой шлях да Чорнага мора.

У адным з папярэдніх нумароў «БУ» мы хваляваліся за лёс атрада для працы на Слуцкім кансервавым заводзе, каб потым сталовыя універсітэта па дагаворанасці атрымлівалі ўзамен карысную прадукцыю. Нарэшце, па словах Генадзя ПАЦЕКІНА, намесніка старшыні прафкома студэнтаў, атрад з дваццаці чалавек створаны на базе філасофска-эканамічнага факультэта. Усё добра ўзважыўшы, філосафы вырашылі: два месяцы — не такі ўжо доўгі прыпынак на шляху ў Феадосію, калі ўлічыць, што лагер працы і адпачынку на моры іх чакае ў верасні; дарэчы, у той самы час, калі астатнія будуць асуджаны на «спатканне» з бульбай.

Т. КАЗАК.

НА РОСТАНЯХ

## А ЮРЫСТЫ СУПРАЦЬ!

Амаль месяц назад гучная аб'ява запрашала студэнтаў і выкладчыкаў БДУ паставіць свае подпісы за ўключэнне на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета БССР пытання аб народнай адукацыі. Напярэдадні пачатку работы Беларускага парламента да навучальных устаноў з просьбай падтрымаць звярнуліся старшыня Камісіі па адукацыі Н. С. Гілевіч і намеснік старшыні Л. П. Баршчэўскі.

Шматлікія ВНУ рэспублікі адразу адгукнуліся на заклік. Не застаўся ўбаку і наш універсітэт. Па словах Анатоля Васільевіча ПАЎЛАВА, старшыні прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў, ніхто нікога не прымушаў, увесь час захоўваўся прынцып добраахвотнасці ў гэтым мерапрыемстве. На пачатку адкрыцця работы сесіі ў Вярхоўны Савет БССР было перадана каля 2 тысяч подпісаў студэнтаў і выкладчыкаў БДУ. Ва ўсёй гэтай справе Анатоль Васільевіч асобна «адзначыў» юрыдычны факультэт, які сабраў... тры подпісы. Так трымаць, юрфак?

АМЕРЫКАНЦЫ Ў ГОСЦІ ДА НАС

## «ПРЫГОЖЫЯ ВАШЫ СТУДЭНТЫ!»

З ПЕРШАГА погляду — гэта тыповы амерыканец, усё ў яго абліччы быццам ідзе насустрач нашаму стэрэатыпнаму ўяўленню пра людзей яго краіны. Прафесар — і ў джынсах. Гадоў 50 яму — а хударлявы, спартыўнага целаскладу...

Але Джон Г. НІ, прафесар факультэта індустрыяльнай інжынернайтэхналогіі Цэнтральнага Мічыганскага універсітэта, прыехаў да нас, здаецца, не для таго, каб пацвердзіць чужыя стэрэатыпы ці набыць свае. Ён прачытаў курс лекцый для студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, наведаў традыцыйны шэраг экскурсій і — згадзіўся на інтэрв'ю з карэспандэнтам «БУ».

**— Вы спецыяльна рыхтаваліся да лекцый для савецкіх студэнтаў? Сваім навучэнцам чытаеце інакш?**

— Зразумела. Тут я рабіў больш моцны акцэнт на агульных пытаннях, бо імкнуўся намаляваць пэўныя напрамкі і тэндэнцыі. А для амерыканскіх студэнтаў больш спыняюся на падрабязнасцях — там маю час для гэтага...

**— Якія адрозненні Вы заўважылі паміж нашымі і вашымі студэнтамі?**

— Трэба адзначыць, даволі істотныя. Савецкія студэнты лепш апранаюцца і, здаецца, аддаюць больш увагі свайму знешняму выгляду, мяркуючы па іх абліччу. Вельмі многа ў вас прыгожых дзяўчат і хлопцаў.

**— Ці задаволены Вы іх увагай да Вашых лекцый?**

— Наведванне было ў сярэднім 50-працэнтнае, я лічу гэта добрым паказчыкам. І тое, як мяне слухалі, таксама. Толькі хацелася пачуць больш пытанняў: звычайна з аўдыторыі іх паступала два-тры. Я думаю, менш афіцыйныя зносіны — у звычайнай размове, на звычайныя тэмы — выклікалі б з абодвух бакоў больш пытанняў і атрымаліся б ажыўленымі, і гэта натуральна.

**— А наогул, якія ўражанні пакінуў у Вас наш горад?**

— Самае моцнае ўражанне — людзі. Паўсюдна мяне сустракала шчырае жаданне дапамагчы і гасціннасць. Да таго ж, у савецкіх людзей высокі ўзровень інтэлектуальных запытаў, я добра гэта зразумеў.

**— Прабачце за нясціплае пытанне. Гэтыя ўражанні супадаюць з тымі, аб якіх Вы раскажаце сваім родным і блізкім?**

— Натуральна! Сваёй жонцы і дзвюм дачкам, якія вельмі чакаюць майго вяртання, я перш за ўсё апішу савецкую гасціннасць і добразычлівасць. Раскажу і пра тое, што ў вашай краіне зараз цяжкія часы, але добрыя перамены відавочныя. Лёс вашых людзей стаў больш залежыць ад іх саміх, і ў лепшую перспектыву можна верыць.

СТУДІНФОРМ

## На сувязі — Ленінград

28—30 чэрвеня ў Ленінградзе Усесаюзная Акцыя салідарнасці студэнтаў. Галоўная мэта Акцыі: заявіць аб надзённых праблемах студэнцтва, унесці свае прапановы для рашэння гэтых праблем, папоўніць добрачынны фонд для студэнцкай моладзі, зрабіць першы крок да стварэння масавага студэнцкага руху.

Ленінград быў невыпадкова выбраны для правядзення такога буйнога па свайму маштабу мерапрыемства. Гэта дэмакратычны горад з багатымі студэнцкімі і культурнымі традыцыямі, горад, дзе не на словах, а на справе актыўна дзейнічае Ленінградская асацыяцыя студэнцкіх прафсаюзных арганізацый.

У час Акцыі адбудуцца сустрэчы з кіраўнікамі розных рангаў, мітынг на Дварцовай плошчы. Гэта стане прыкладам для правядзення падобных мерапрыемстваў у рэгіёнах.

Як паведаміў нашаму карэспандэнту Ілья Уладзіміравіч ЗВЕРАЎ, распарадчык Акцыі, на этапе падрыхтоўкі ніякіх пытанняў не ўзнікае. Агульны сметны кошт Акцыі да 2 красавіка 1991 года склаў 850 тысяч рублёў. Фінансуе мерапрыемства Дырэкцыя камерцыйных праграм. Для студэнтаў падрыхтаваны пуцёўкі (50 працэнтаў ад кошту будзе плаціць прафсаюзны камітэт ВНУ, другая палова сумы паступіць ад продажу фірменных камплектаў з сімволікай Акцыі).

«Лішнімі» не будуць тыя госці, якія збіраюцца прыехаць на Усесаюзную Акцыю салідарнасці студэнтаў без накіравання прафсюзных камітэтаў.

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

# ШТО ЗРОБІШ? РЫНАК...

*Прыемна адчуваць сябе ў «стыпендыяльны» дзень хоць на імгненне, але багатым. Усё было б добра, калі б грошы не валодалі загадкавай якасцю — знікаць амаль што цалкам праз некалькі дзён. Шмат іншых пытанняў перыядычна ўзнікае вакол гэтай тэмы: адкуль бяруцца грошы на студэнцкую стыпендыю, чаму, здараецца, выплочваюць яе са спазненнем.*

За адказам мы звярнуліся ў бухгалтэрыю.

Існуючыя памеры стыпендыі, аказваецца, былі ўстаноўлены на саюзным узроўні і дзейнічаюць на тэрыторыі ўсёй краіны. Пастанова Кабінета міністраў СССР ад 20 мая 1991 года вызначыла цяперашні мінімальны ўзровень стыпендыі — 120 рублёў (улічваючы 60 кампенсацыйных). Выдатнікі атрымліваюць 150 рублёў у месяц, а тыя, хто мае выдатныя і добрыя адзнакі,— 135. Грошы звыш гэтага (без іншых кампенсацыйных выплат) атрымліваюць сіроты і інваліды, раненыя ці кантужаныя пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане.

У планава-бюджэтным аддзеле засведчылі, што стыпендыяльны фонд БДУ складае ў 1991 годзе 11 мільёнаў 133 тысячы 900 рублёў. Што б ні здарылася, на стыпендыю грошы знойдуцца. Іншая справа — індэксацыйныя і кампенсацыйныя выплаты. Іх трэба браць кожны раз з бюджэту наступнага месяца. Становішча даволі нестабільнае.

На жаль, многім іншагароднім студэнтам месцаў у інтэрнатах не хапае, даводзіцца жыць дзе прыдзецца. Спецыяльнай пастановай урада выдзелена 4 мільёны 557 тысяч рублёў, каб пакрыць выдаткі студэнтам, якія жывуць на кватэрах. Гэта 20 рублёў у месяц. Сума, відавочна, недастатковая. Яна была яшчэ больш-менш прымальнай да 2 красавіка, але зараз іншы час, іншыя цэны.

У гэтым годзе апрабіруецца яшчэ адна навінка — пачалі выплочваць грошы юнакам, якія займаюцца па праграме ваеннай падрыхтоўкі на ваеннай кафедры. Тым, хто служыў у войску, але жадае атрымаць званне афіцэра запасу, плоцяць 25 працэнтаў ад памеру мінімальнай стыпендыі, астатнім — 15 працэнтаў.

Уявім, што студэнт 3 курса вучыцца добра і атрымлівае 135 рублёў плюс 30 рублёў на харчаванне і зусім мізэрную суму індэксацыі (у межах 7—10 рублёў). Мы налічылі прыблізна 190 рублёў. У той жа час толькі на харчаванне ў дзень ідзе 5—7 рублёў. у месяц — прыблізна 180. Застаецца 10 рублёў: на кнігі і сшыткі, на куртку і джынсы, на тэатр і кветкі для каханай. Сумная статыстыка...

Андрэй АРШАНСКІ,
студэнт факультэта журналістыкі.

НУ І НУ!

# АГОНІЯ ЖАНРУ?

«ЗАЛАТЫ» век літаратурнай рэцэнзіі як жанру публіцыстыкі мінуў»,— кажуць даследчыкі. Імкнецца які-небудзь журналіст да адзнакі новага твора праз буралом аналізу, і не ведае, што яго занятак пад пагрозай. Папярэджваю: беларуская рэцэнзія знікае. Пакуль што не паўсюдна, са старонак асобных выданняў. Знікае з «Маладосці», мяняе свой твар у «ЛіМе» — я ўжо не кранаю абласныя і раённыя выданні. Калі вобласць яшчэ друкуе агляды творчасці сваіх землякоў з элементамі рэцэнзавання, то раённы друк цалкам засяроджаны на кранаючых мясцовых тэмах і ігнаруе літаратуру прынцыпова. Як вяршыня айсбергаў, на паверхні застаюцца цэнтральныя выданні, якія бліжэй стаяць да культуры, ім лягчэй рэцэнзаваць. Разгледзім факты: у 1988 годзе «Маладосць» змясціла каля 10 рэцэнзій, у 1989 годзе іх толькі 5, першая палова 1990 года — часопіс маўчыць, потым, спахапіўшыся, рэцэнзуе па дзве кнігі запар і перакрывае мінулагодні вынік — 6 рэцэнзій. У гэтым годзе з пяці нумароў ні адзін не змяшчае рэцэнзіі. Пішуць пра спадчыну, Чарнобыль, літаратурны працэс — а рэцэнзій няма, нібы перасталі выходзіць новыя кнігі. Справа ў тым, што жанр выцеснены іншымі, больш надзённымі публікацыямі. А рэцэнзію з яе літаратурнымі, культурнымі праблемамі адхінулі ўбок, нібы яна — забаўка для эстэтаў.

Пэўна, аб'ектыўная прычына заключана ў тым, што жыццё на першы план выпхнула сацыяльна-палітычныя праблемы, а літаратура апошнім часам усё больш апалітычная, займаецца ўнутраным светам чалавека, працуе не на «злобу дня» — як заўсёды бывае ў часы крызісу — таму ў нечым не адпавядае моманту. Падумайце: рэцэнзуюцца найчасцей зборнікі вершаў, а гэта не публіцыстыка. Заўтра ўсё можа змяніцца, а сёння мала запрасіць: «Пішыце больш!». Ёсць яшчэ праблемы.

Трэба затрымаць якасць. Дэградацыя рэцэнзіі, якая ператвараецца ў анатацыю,— лёгкі рэкламны твор, што знаёміць чытача са зместам новай кнігі — пагражае існаванню рэцэнзіі як жанра. Напэўна, можна знайсці і аб'ектыўныя прычыны: сёння больш трэба рэкламаваць, чым аналізаваць літаратуру, анатацыя больш павярхоўная, ілюстратыўная, лепш зразумелая чытачу з-за сваёй нескладанасці. Аднак і рэцэнзія, і анатацыя могуць і павінны суіснаваць, а не ўяўляць сабой нованароджаны сімбіёз двух элементаў, якія ні Богу свечка, ні чорту качарга.

Бачыце — «чыстых» рэцэнзій, якія б адпавядалі канонам тэорыі, няшмат. Што рабіць з гэтае нагоды? Загадаць пісаць па шаблону? Але творчы падыход можа ўратаваць становішча. Трэба проста азірацца раз-пораз на патрабаванні жанру, у межах якога ствараеш, і, трымаючыся пэўных канонаў, ставіць рэчы на свае месцы. У гэтым — паратунак ад зрашчэння жанраў.

Шукаючы рэцэнзіі сярод неабсяжных стосаў беларускай перыёдыкі, нібы іголкі ў стагу, я заўважыла, што існуюць быццам бы два варыянты аднаго жанру літаратурнай рэцэнзіі — часопісны варыянт, які набліжаецца да глыбокага літаратуразнаўчага даследвання (так званая аналітычная рэцэнзія), і спрошчаны, грымуча-патэтычны газетны варыянт, у якім спыняюцца толькі на ідэйна-тэматычным вузле твора, не заўважаючы «тэхніку» пісьма і форму, а яны таксама маюць права на ўвагу да сябе. Вонкава гэта натуральна — тэксты газеты і часопіса павінны адрознівацца глыбінёй. Але менавіта з газеты пачынаецца «ператварэнне» рэцэнзіі ў анатацыю. Спрошчанасць і патэтыка не ідуць на карысць. Сітуацыя, калі ў падручніку адно, на практыцы — другое, патрабуе змен. Узровень рэцэнзіі трэба мець на ўвазе.

Рэцэнзаванне — гэта складана, кажу па ўласнаму невялікаму вопыту. Патрабуе смеласці мець свае меркаванні, умення арыентавацца ў плынях літаратуры, густу і чуйнасці ад крытыка. Да таго ж, патрэбныя эмацыянальнасць і імпэт публіцыста, каб зрабіць з такой сумнай рэчы, як дасканалая рэцэнзія, нешта чытэльнае. Такі набор якасцей рэдка ад прыроды выпадае адной асобе. Таму рэцэнзента трэба вырошчваць недзе ў нетрах навучальных устаноў. Тады можна спадзявацца на будучае.

А зараз назіраецца такая цікавая з'ява, як нарошчванне суб'ектыўнасці. Пад корань, як піша крытык С. Кавалёў, падрублены міф аб аб'ектыўнасці крытыкі, і пачалі з'яўляцца суб'ектыўныя рэцэнзіі, напрыклад Т. Чабан у «Маладосці». Мне здаецца, гэта вынік пэўнай дэмакратызацыі, калі індывідуальнасць бярэ верх над бястварым рэцэнзаваннем. Адчуваеш Асобу, якая шукае сваіх шляхоў.

Н. ЖУК.

ЧАС-ПІК

Экзаменацыйная сесія завітала не толькі ў свецкія ВНУ...

Мінская духоўная семінарыя, што знаходзіцца ў Жыровічах і была адкрыта некалькі гадоў назад, таксама непакоіцца наконт прафесійнай падрыхтоўкі сваіх слухачоў.

— Літаральна пару месяцаў назад выйшла ўказанне Маскоўскай Патрыярхіі аб пераводзе духоўных семінарый у разрад вышэйшых навучальных установаў,— растлумачыў рэктар семінарыі айцец Канстанцін.— Праблема паспяховасці існуе і ў нашых навучальных установах. Уявіце сабе, за год нам давялося адлічыць за непаспяховасць 10 з 80 навучэнцаў.




# НА БОГА СПАДЗЯВАЙСЯ — САМ НЕ ПАМЫЛЯЙСЯ

Як бачна, студэнт застаецца студэнтам. Без розніцы, вучыць ён палітычную гісторыю ці Новы Запавет. У семінарскіх аўдыторыях час ад часу адчыняюцца рыпучыя дзверы і са словамі «Слава Богу!» чарговы экзаменуемы накіроўваецца ў манастырскую царкву, каб паставіць свечку за паспяховую здачу экзамену.

А. ГУСАК,
фота аўтара.



# «Дзе мы? Куды прывёў нас?..»

**Князь Уладзімір, забіўшы Полацкага князя Рагвалода, захапіў яго зямлю і гвалтоўна зрабіў сваёй жонкай яго дачку Рагнеду...**

Сведкамі гэтых падзей мінулага нашай Радзімы сталі... гледачы, якія прысутнічалі на спектаклі «Выгнанне ў рай» паводле п'есы А. Рапа. Першым творам адкрыў сваю дзейнасць Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра «Зніч». З часу тых падзей, якія апісаны ў творы, прайшло ўжо шмат стагоддзяў. Але паміж мінулым і сучасным існуе цесная сувязь. Таму ў думках людзей, якія звяртаюцца да гісторыі, звычайна з'яўляюцца нейкія паралелі, аналогіі з сённяшнім днём. Узніклі яны і ў гутарцы нашага карэспандэнта з актрысай Галінай Аляксееўнай ДЗЯГЕЛЕВАЙ.

**— Галіна Аляксееўна, як Вы ставіцеся да ідэі моцнай цэнтралізаванай дзяржавы, якую хацеў стварыць князь Уладзімір і якая існавала ў нас да гэтага часу?**

— Князь Уладзімір казаў: «Калі шчаслівы будзе ўвесь народ, тады і кожны сваю долю атрымае, пакуль жа я не магу бачыць твары, я зазіру ў іх потым». Але ж нельга прынесці шчасце насільна. Саюз злучае толькі роўных, не «быдла». Кожны народ мае права на своеасаблівасць. Розныя вобразы павінны быць, тады і будзе саюз.

**— Напэўна, нельга вярнуць родную мову не праз тры, не праз дзесяць гадоў, бо яна прыгняталася стагоддзямі. Не адно пакаленне беларусаў выхавалася на рускай мове, рускай літаратуры. І, напэўна, не адно пакаленне яшчэ зменіцца, пакуль народ вернецца да роднай мовы. Для гэтага патрэбна нялёгкая і доўгая праца.**

— Так. Я баюся, каб не адбылося гэта, як у нас звычайна было райней амаль што з кожнай новай справай — спачатку ўздым, а потым раптам балючы адыход, нават не адыход, а міжвольнае вяртанне. Гэта можа здарыцца і з нашай мовай — пройдзе яшчэ некалькі гадоў, як быццам бясплённа для яе, і скажуць: «Добрая была задума, але, на жаль, не атрымалася».

**— Ёсць думка, што цяпер важней за ўсё вырашэнне эканамічных праблем і не час надаваць увагу нацыянальным.**

— Калі людзі ідуць на плошчу толькі таму, што ім хочацца есці, гэта яшчэ не значыць, што выйшаў народ. Голад чалавек адчувае інстынктыўна, страўнікам. як жывёла, а не розумам і не сэрцам. Народам людзі становяцца тады, калі ў іх прачынаецца самасвядомасць, калі яны пачынаюць думаць і глядзець наперад, памятаючы сваё мінулае.

**— Я вось часта задаю сабе такое пытанне: а навошта людзям ведаць сваю гісторыю?**

— Менавіта пра гэта і гаворыцца ў пачатку спектакля: «Дзе мы? Куды прывёў нас?..» Маецца на ўвазе гістарычны шлях, пройдзены народам. Калі чалавек не ведае, адкуль ідзе, то як зможа адказаць, дзе ён апынецца?

**— Вы назвалі нас сляпымі. Якія лекі Вы прапануеце ад гэтай слепаты?**

— Не толькі вас, але і сябе таксама. А лекі?.. Напэўна, праца з усіх бакоў. І каб была магчымасць карыстацца роднай мовай. Нам кажуць: «Гаварыце, хто вам не дае?» Але ж падручнікаў няма, беларускамоўнай літаратуры выдаецца мала, дадатковых дапаможнікаў няма.

**— У ранейшыя часы мова захоўвалася ў асноўным ў народным гушчы, а цяпер, калі можна так сказаць, ролі змяніліся, і вырашаць гэтую задачу інтэлігенцыі.**

— Цяпер такі час, што мова не будзе ўжо захоўвацца ў народзе. Хоць гэта і жахлівыя словы, але, на жаль, і народ можа звесціся. Моладзь ужо не тая, што была калісьці, не з каранёў, яна «не мае твару». Гавораць яшчэ нашы бабулі на роднай мове, але ж яны не вечныя. Таму вельмі патрэбны гэты тэатр, каб адраджаць беларускую інтэлігенцыю, тых асоб, якія будуць захоўваць сваё, роднае. Такая інтэлігенцыя ўжо з'яўляецца. Ёсць у нас свае маладыя таленавітыя паэты: «Сокалаў—Воюш, Рублеўская і іншыя.

**— І ў сувязі з папярэднім пытаннем, нарэшце, што б Вы хацелі пажадаць тым, хто ў будучым будзе складаць нашу інтэлігенцыю,— студэнтам?**

— Я ўпэўнена, што яны вельмі цікавыя і інтэлектуальна развітыя людзі, што яны дапамогуць адраджэнню нашай роднай старонкі.

Гутарку вёў
А. ВІТКОЎСКІ,
студэнт першага курса факультэта журналістыкі.

СЛУЖБА 03

# Справа — тытунь

Многія ведаюць, што тытунь утрымлівае некалькі відаў атруты, самы моцны з якіх — нікацін. У чыстым выглядзе адна кропля гэтай атруты смяротная. У час палення ў арганізм трапляе нязначная доза нікаціну, але шматгадовае паленне прыводзіць да хранічнага атручвання нікацінам галоўнага мозгу.

Нервовая сістэма, сэрца, крывяносныя сасуды, дыхальныя шляхі, страўнік і кішэчнік, вочы, палавыя органы — усе часткі арганізма адчуваюць шкоднае ўздзеянне нікаціну і іншымі ядамі, кацэрагеннымі рэчывамі.

Асабліва шкодна нікацін уздзейнічае на функцыю палавых органаў. У мужчын, якія доўгі час паляць, патэнцыя слабее, у жанчын аслабляюцца мышцы маткі, узнікае магчымасць паталогіі ў час родаў, а ў цяжарных — заўчасныя роды ці выкідышы. Згубная роля як алкаголю, так і тытуню, вельмі вялікая.

Памятайце, будучыя бацькі, лёс дзяцей у вашых руках.

**Г. ГАЛЬЧАНЮК,**
урач.



ЦІП-ТОП

# У пошуках вялікай вады





Наш турысцкі сезон у гэтым годзе пачаўся з падарожжа па адной з рэк Карпат — Белым Чарамошу. Шмат розных баек можна пачуць ад турыстаў-воднікаў аб Белым Чарамошу. І заўсёды ўражвае неўтаймаваны і нечаканы нораў ракі. Нас Белы Чарамош таксама ўразіў... сваім мелкаводдзем, непраходнасцю і халодным дажджом.

Першы па апісанню трохкаскадны парог «Гарбы» аказаўся праходным толькі напалову. Прыступкі парогу да драбнюсенькіх камянёў праглядваліся з берагу. Дзе адпіхваючыся ад камянёў, дзе працягваючы нашы судны, мы пакінулі «Гарбы» ззаду. Гэты дзень сплаву закончыўся для нас даволі бвйной аварыяй: у катамарана амаль поўнасцю разарвалася днішча. Палаткі ставілі пад праліўным дажджом і наступныя два дні займалася «залізваннем» ран.

Зрэшты цыраванне катамарана не дапамагло. На першых жа кіламетрах шляху днішча набыло свой першапачатковы выгляд. Катамаран з паловай экіпажа прыйшлося адправіць на спадарожнай машыне. Экіпаж байдаркі мужна вырашыў прадзірацца ўперад па камянях, дзе яго чакалі два парогі — «Дудкі» і «Варотцы».

Так пачалося наша падарожжа. І ўжо другі вясенні сезон запар нам не шанцуе з вялікай вадой. Складанасць рэк, якія мы праходзім, узрастае. Але наперадзе яшчэ шмат паходаў, і мы спадзяёмся «злавіць вялікую ваду».

**Р. ІГНАТОВІЧ,**
малодшы навуковы супрацоўнік
НДІ ПФП.

**19 чэрвеня спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння выдатнага беларускага вучонага, вядомага фізіка-тэарэтыка, Героя Сацыялістычнай Працы, Лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, заслужанага дзеяча навукі БССР, акадэміка АН БССР, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Фёдара Іванавіча ФЕДАРАВА.**

З ЮБІЛЕЕМ!

# Старэйшына беларускіх фізікаў

З імем Ф. І. Фёдарава — першага кандыдата і першага доктара фізіка-матэматычных навук у БССР — непарыўна звязаны ўсе этапы станаўлення, развіцця і росквіту гэтых навук у нашай рэспубліцы, арганізацыі вышэйшай адукацыі, падрыхтоўкі навуковых кадраў і маладых спецыялістаў па фізіцы і матэматыцы.

Фёдар Іванавіч прыйшоў у вялікую навуку, калі апошнім словам у тэорыі ўзаемадзеяння элементарных часціц была квантавая электрадынаміка, метады якой толькі ствараліся, і першыя навуковыя працы аспіранта Фёдарава былі выкананы менавіта ў гэтай галіне. Усяго за тры гады ён ліквідуе прабелы ў сваёй спецыяльнай падрыхтоўцы, авалодвае самымі новымі ідэямі і метадамі тэарэтычнай фізікі. Выключная адоранасць, велізарная працаздольнасць і рэдкая арганізаванасць ужо тады адрознівалі яго, і гэта дазволіла бліскуча вытрымаць складанейшае выпрабаванне і ў тэрмін завяршыць дысертацыю «Прымяненне метаду функцыяналаў да некаторых пытанняў тэорыі выпраменьвання».

Пасля паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі (1936 г.) Ф. І. Фёдараў вяртаецца ў Мінск, у БДУ, дзе толькі што пачаў функцыяніраваць фізіка-матэматычны факультэт. Фёдар Іванавіч з вялікім энтузіязмам уключаецца ў работу, аддаючы ўсю сваю творчую энергію, талент вучонага і незвычайны педагагічны дар выкладанню, арганізацыі вучэбнага працэсу і разгортванню навукова-даследчай работы на факультэце.

Кафедра тэарэтычнай фізікі БДУ, якую Ф. І. Фёдараў арганізаваў і ўзначальваў на працягу амаль чвэрці стагоддзя, стала цэнтрам не толькі вучэбна-педагагічнай, але і навукова-даследчай работы на фізіка-матэматычным факультэце.

У самыя цяжкія для БДУ ваенныя і пасляваенныя гады Ф. І. Фёдараў — дэкан фізіка-матэматычнага факультэта. Сёння ўжо цяжка ўявіць, колькі праблем прыходзілася вырашаць у 1943 годзе, калі на падмаскоўнай станцыі Сходня факультэт аднавіў сваю работу, і асабліва са жніўня 1944 года пасля вяртання універсітэта ў толькі што вызвалены Мінск. Акупанты разбурылі універсітэцкія корпусы, разграбілі лабараторыі і бібліятэкі. Усё трэба было пачынаць спачатку. Дзякуючы самаадданай працы супрацоўнікаў і студэнтаў, дапамозе буйнейшых навуковых і універсітэцкіх цэнтраў краіны, фізіка-матэматычны факультэт у кароткі тэрмін запрацаваў на поўную сілу, тут былі сабраны найбольш кваліфікаваныя навукова-педагагічныя кадры фізікаў і матэматыкаў Беларусі, і іх лідэрам бясспрэчна стаў Ф. І. Фёдараў.

У БДУ Фёдар Іванавіч працягвае свае навуковыя даследаванні па квантавай электрадынаміцы і тэорыі элементарных часціц. Адначасова ён пачынае распрацоўку прынцыпова новых метадаў тэарэтычнай крышталяоптыкі. Вынікам з'явілася бліскучая абарона ў 1954 годзе доктарскай дысертацыі «Інварыянтныя метады ў оптыцы анізатропных асяроддзяў».

У 1955 годзе — з моманту ўтварэння Інстытута фізікі і матэматыкі АН БССР — Ф. І. Фёдараў становіцца на чале адной з чатырох першых фізічных лабараторый — лабараторыі тэарэтычнай фізікі, дзе асабліва яскрава раскрыўся яго талент як вучонага і навуковага кіраўніка. У 1956 годзе, ён выбіраецца членам-карэспандэнтам, у 1966 — акадэмікам АН БССР. З 1963 па 1987 год з'яўляўся акадэмікам-сакратаром аддзялення фізіка-матэматычных навук АН БССР, правадзіў вялікую арганізацыйную работу па каардынацыі навуковых даследаванняў па фізіцы і матэматыцы ў рэспубліцы. З 1987 — саветнік Прэзідэнта АН БССР, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі АН БССР.



Пры усёй сваёй занятасці навукова-арганізацыйнымі справамі Ф. І. Фёдараў — перш за ўсё буйны фізік-тэарэтык, вучоны, які не ўяўляе свайго існавання без навукі. Імкненне да пастаяннага навуковага пошуку — адметная рыса яго характару. З асаблівай сілай своеасаблівасць яго навуковай творчасці праявілася ў стварэнні новых бескаардынатных каварыянтных метадаў тэарэтычнага даследавання, якія падыходзяць для шырокага кола важнейшых фізічных задач. Іх выкарыстанне дазволіла ўпершыню пабудаваць агульную тэорыю аптычных уласцівасцей крышталяў, якія валодаюць усімі магчымымі відамі анізатропіі, тэорыю, свабодную ад унутраных супярэчнасцей. Фундаментальныя вынікі, атрыманыя Ф. І. Фёдаравым у галіне крышталяоптыкі, адзначаны ў 1976 годзе Дзяржаўнай прэміяй СССР.

Навуковая дзейнасць Фёдара Іванавіча вызначаецца смелым падыходам да вырашэння разнастайных праблем, глыбокай фізічнай інтэрпрэтацыяй, строгім матэматычным і лагічным абгрунтаваннем атрымліваемых вынікаў. У яго працах, як правіла, распрацоўваюцца новыя агульныя метады рашэння фізічных задач, якія адкрываюць шырокія магчымасці для далейшых канкрэтных даследаванняў.

Адзін з важнейшых паказчыкаў плённай работы вучонага — стварэнне ўласнай школы. Школа Фёдарава — гэта тры новыя навуковыя напрамкі ў трох актуальных галінах сучаснай фізікі: оптыцы анізатропных асяроддзяў, тэарэтычнай крышталеакустыцы і тэорыі элементарных часціц. Гэта каля 400 арыгінальных артыкулаў і 6 буйных манаграфій, якія атрымалі шырокае ўсесаюзнае і міжнароднае прызнанне. Школа Фёдара — гэта 19 дактароў, каля 50 кандыдатаў навук, якія выраслі пад яго кіраўніцтвам. Сярод іх кіраўнікі буйных навуковых калектываў рэспублікі, стваральнікі уласных навуковых напрамкаў.

Фёдар Іванавіч заўсёды выхоўваў вучняў перш за ўсё асабістым прыкладам, бязмежнай адданасцю справе навукі, выключна высокай патрабавальнасцю да сябе і да вынікаў сваёй працы. Фёдара Іванавіча прыцягвала таямніца стварэння свету. І ён разумеў яе праз формулы, музыку, паэзію. Калі быў студэнтам, замест адной, заведзенай, вывучыў тры замежныя мовы і свабодна размаўляе на англійскай, нямецкай і французскай. Яго адоранасць уражвае. Ён з захапленнем займаўся спортам: акрабатыкай, гімнастыкай і плаваннем, гульнямі і боксам, што дазваляе яму кінуць выклік натуральным законам чалавечай прыроды — ён і зараз па-спартыўнаму падцягнуты. А шахматы? З добрым партнёрам — ночы запар. А кнігі? А падарожжы па краіне? Хоць, зразумела, захапленні даводзіцца абмяжоўваць. Навука раўнівая, ёй патрэбна усё жыццё.

Дзейнасць Ф. І. Фёдарава надзвычай шматгранная і markup разнабаковая. Ён — член Савецкай Гравітацыйнай камісіі, старшыня навуковага савета і каардынатар комплекснай рэспубліканскай праграмы «Чаціца», старшыня Міжведамаснага Савета Цэнтра па апрацоўцы ядзернай фільмавай інфармацыі пры АН БССР і Міністэрстве народнай адукацыі БССР, старшыня Мінскага ГК абароны міру, намеснік старшыні Беларускага аддзялення савецкага Фонду міру, сапраўдны член Акадэміі творчасці СССР, рэктар Універсітэта народнай дыпламатыі. Ён — галоўны рэдактар часопіса «Весці АН БССР, серыя фізіка-матэматычных навук», член рэдакцыйнай калегіі усесаюзнага «Часопіса прыкладной спектраскапіі», БелСЭ, навуковы рэдактар многіх манаграфій, кніг і зборнікаў навуковых прац. Фёдар Іванавіч з'яўляецца прэзідэнтам Беларускага фізічнага таварыства, намеснікам старшыні таварыства «Веды» Беларускай ССР, членам Праўлення Саюза навукова-інжынерных таварыстваў СССР і Усесаюзнага фізічнага таварыства.

Тытанічная праца Ф. І. Фёдарава атрымала высокую адзнаку і прызнанне. І ён удастоены многіх ганаровых званняў і ўрадавых узнагарод, у тым ліку высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны».

Але высокія ўзнагароды, тытулы і адказныя пасады не змянілі яго. Ён заўсёды застаецца вучоным па прызванню, які не ўяўляе свайго жыцця без навукі.

**Л. ШЫБАЛКА,**
выпускніца фізічнага факультэта.

ВІДАВОЧНАЕ — НЕВЕРАГОДНАЕ

*«Наступнай раніцай усе газеты абвесцяць чарговую сенсацыю стагоддзя — замяняльнік чалавечага розуму ў прабірцы! Гэта будзе заўтра, а сёння яшчэ неабходна ўдакладніць паказальнікі прыбораў, працуючых у сістэме xyz. Кожную хвіліну ЁН павінен павялічвацца ў сваіх памерах у 0,00083 разы. Не больш, не менш».*

# ЧАЛАВЕК — МАШЫНЕ СЯБРА?

Уладзімір Васільевіч ГАЛЯНКОЎ, загадчык лабараторыі па стварэнню штучнага інтэлекту Інстытута тэхнічнай кібернетыкі АН БССР:

— На жаль, павінен расчараваць аматараў таямнічых нечаканасцей. Заўсёды ствараецца ажыятаж вакол навуковых даследаванняў. Гэта шкодзіць навуцы. Для галіны штучнага інтэлекту такое становішча асабліва характэрна. Ажыятаж вядзе да таго, што пранікае вялікая колькасць людзей, якіх хвалюе не само гэтае пытанне, а магчымасць асабістага «ўдзелу» ў такой адмысловай галіне. Узнікае дылетанцтва, славалюбства, хаўтура. Галіна, якая вывучае штучны інтэлект, пакутуе як ніякая іншая ад вялікай колькасці некваліфікаваных людзей, сцвярджаючых, што яны працуюць у гэтым напрамку кібернетыкі. Гэта вядзе да несур'ёзных заяў, дыскрэдытацыі. Сапраўдны вучоны не мае патрэбы ў пабочнай цікаўнасці, ён сам у сабе цікаўнасць культывуе. Галоўнае, каб было дастатковае для даследаванняў фінансаванне.

*«Ён існуе, жыве, дзейнічае, павялічваецца ў памерах кожную долю імгнення. Чалавецтва атрымала адзіны звышрозум на ўсіх. Што цяпер азначае індывідуальны мазгавы цэнтр у параўнанні з гэтым звыш!..»*

— Сам тэрмін «штучны інтэлект»,— працягвае Уладзімір Васільевіч,— не адэкватны, таму няма нічога дзіўнага ва ўзнікненні самых розных асацыяцый. Вучоныя да такіх тэрмінаў ставяцца менш узрушана, спрабуюць іх строга вызначыць у сваім асяроддзі. У незнаёмых жа з сэнсам работ, праводзімых тут, дзейнічаюць фантастычныя домыслы, роздумы на тэму «Ці можа машына думаць, як хутка гэта здарыцца?» Мы ўсяго толькі працуем у галіне, якую ўжо і пярэднім краем кібернетыкі рэдка хто называе. Асноўны напрамак выкарыстання сродкаў штучнага інтэлекту — экспертныя сістэмы. Гэты тэрмін не намнога лепшы за тэрмін «штучны інтэлект» (ШІ), аднак некалькі «гуманістычны».



*«Нарэшце чалавек вызваліцца ад штодзённага насілля над уласным галоўным мозгам. ШІ разліча жыццё ўсяго грамадства і кожнага чалавека паасобна. Любая пачатая справа ўжо мае на ўвазе станоўчы вынік. Станоўча?..»*

— Недарэчна ставіць такую мэту, як стварэнне нейкага пратэза чалавечага мозгу,— гэта зноў У. В. Галянкоў.— Чалавек у стане выконваць свае задачы. Сутнасць толькі ў тым, каб вызваліць яго ад нейкіх руцінных спраў, дзе машына можа справіцца лепш, а галоўнае — хутчэй.

Сучасны традыцыйны сродак перапрацоўкі інфармацыі — вылічальныя машыны. Практыка прымушае ўрывацца ў такую галіну перапрацоўкі інфармацыі, дзе мы не здольныя або дакладна сфармуляваць задачу, або правільна вызначыць яе алгарытм і рознага роду метады сінтэзу алгарытмаў, выпадкі, калі мы збіраемся будаваць яго з нейкіх цаглінак. Пра нагаданыя вышэй экспертныя сістэмы. Сваё шырокае прымяненне яны знайшлі ў медыцынскай дыягностыцы. Звышкласны дыягност відавочна лепш выканае работу, але ўлічваючы, што спецыялістаў недастаткова, і іх вопыт трэба растыражыраваць для выкарыстання ў розных месцах, а таксама абмежаванасць у часе — усё гэта гаворыць на карысць электронных дыягностаў.

Нішто яшчэ і ў нашай галіне не жыццяздольнае без чалавека. Кожная, нават высокакласна спрацаваная экспертная сістэма патрабуе падстрахоўкі з боку чалавека, г. зн. пра «інтэлект» такіх тэхнічных сродкаў не можа быць і гаворкі (па меншай меры, у бліжэйшыя 40—50 дзесяцігоддзяў). Вось аб гэтым часе можна шмат фантазіраваць. Але ж мы з вамі вядзём сур'ёзную гаворку...

С. АЗАРЭВІЧ.

# МАСТЕРА

МИМОХОДОМ

## Учредительная конференция МЖК «Сухарево»

состоится 13 июня в 15.30 по адресу: ул. Казинца, 4, актовый зал. На повестке дня — утверждение устава, выборы председателя Совета, Оргкомитета, ревизионной комиссии.

КСТАТИ, многоопытные эксперты городского штаба МЖК вынуждены признать представленный проект устава «сырым», отмечая стилистические недоработки, неустойчивость терминологии, отсутствие «обратной» связи.

В ШТАБЕ МЖК

## О политическом моменте

*SOS!* ДАЛЬНЕЙШЕЕ ПРОЦВЕТАНИЕ ДВИЖЕНИЯ МЖК В ГОРОДЕ МИНСКЕ ПОСТАВЛЕНО В ПРЯМУЮ ЗАВИСИМОСТЬ ОТ СРОКОВ СДАЧИ ДОМА № 18 МЖК «УРУЧЬЕ».

Вопрос в том, как убедить «эмжековцев», особенно тех, кто уже успел отработать трудовую программу. На долю вновь избранного председателя Оргкомитета «Уручье» выпали труднейшие испытания, учитывая, что сроки действительно поджимают: государственная комиссия будет рассматривать вопрос о принятии дома 30 июня, в то же время — дел на объекте непочатый край.

Как бороться? Использовать систему «штрафных» или «поощрительных» баллов? Создавать штаб стройки? Обсуждать программу совместных действий со строителями? Пойти с протянутой рукой к руководителям предприятий, в чьей власти командировать членов МЖК, которые получают квартиры в доме № 18, на отделку собственных квартир? Среди десятка предложений членов городского штаба МЖК — ни одного готового рецепта.

БЫТЬ В МИНСКЕ МЖК ИЛИ НЕ БЫТЬ? ВСЁ РЕШАТ ОРГАНИЗОВАННОСТЬ, ЭНТУЗИАЗМ И СОБРАННОСТЬ ЧЛЕНОВ МЖК «УРУЧЬЕ» В ОСТАВШИЕСЯ ДВЕ НЕДЕЛИ.



## Приоритет — строительству

Как известно, на III отчетно-выборной конференции МЖК «Уручье» среди трех выдвинутых кандидатур победил Игорь БОРИСЕНКО, чья программа пришлась по душе большинству делегатов. Создавя ее, Игорь учитывал основной фактор — наличие трех категорий «эмжековцев» (получившие квартиры, занятые на строительстве комплекса и участвующие в соревновании), а также то, что на сегодняшний день, как ни печально, Совет оторван от стройки, а Оргкомитет от предприятий-дольщиков и Совета.

Приоритетное направление, по мнению нового председателя Оргкомитета «Уручье»,— строительство комплекса. Его программа предусматривает решение таких «зыбких» вопросов, как снабжение, рациональная организация труда, жесткий контроль за отработкой трудовой программы, включая и широкую информированность всех членов МЖК, а также четкое и рациональное взаимодействие с СУ-52. Что еще способно ускорить строительство? Создание малого предприятия строительной ориентации, которое бы выполняло ограниченный объем строительных работ на субподряде у СУ-52; учитывая опыт дома № 18, проработать вопрос о долевом участии МЖК в строительстве кирпичного завода. Панацеей от обезличивания средств МЖК новый председатель Оргкомитета видит во введении внутренних счетов МСО отдельных домов. Средствами, заработанными бойцами данного дома, прежде всего распоряжается штаб МСО.

Ликвидацию одного из самых слабых мест — взаимодействие с предприятиями-дольщиками — Игорь Борисенко видит в заключении взаимных договоров, предлагает и «горизонтальную» связь с другими МЖК. Экономическую программу дополняет не менее продуманная социальная.

Ознаменование начала работы столь обширной и одновременно конкретизированной программой дает основания полагать, что с приходом нового председателя оживет и Оргкомитет. Тем более, что Игорь Борисенко расчитывает на поддержку представителей Оргкомитета.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

13 чэрвеня

Зак. 2068-2069

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.